9. История Востока : в 6 т. / отв. ред. Р. Г. Ланда. – М. : Вост. Литература, 2006. – Т. 5: Восток в новейшее время: 1914–1945 гг. – 717 с.
10. Молодяков, В. Э. История Японии. XX век / В. Э. Молодяков, Э. В. Молодякова, С. Б. Маркарьян. – М. : Издательство «Крафт+», 2007. – 528 с.
11. Сидоров, А. Ю. История международных отношений. 1918–1939 гг. : учебник / А. Ю. Сидоров, Н. Е. Клеймёнова. – М. : ЗАО Центрполиграф, 2006. – 640 с.
12. Космач, В. А. Начало и причины Второй мировой войны в современной российской историографии / В. А. Космач // Наука – образованию, производству, экономике: матер. XXI(68) региональной науч.-практ. конф. преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, Витебск, 11–12 февраля 2016 г.: в 2 т. / Вит. гос. ун-т ; редкол.: И. М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2016. – Т. 1. – С. 282–283.
13. Марков, А. Почему не 1937-й? Когда началась и когда закончилась Вторая мировая война / А. Марков // Завтра. – 2024. – Июль. – № 26(1589). – С. 4.
14. Зимонин, В. Когда Япония начала Вторую мировую / В. Зимонин // Завтра. – 2024. – Июль. – № 29(1592). – С. 4.
15. Мировые войны XX века : в 4 кн. / отв. ред. Е. Н. Кульков. – М. : Наука, 2020. – Кн. 3: Вторая мировая война: истор. очерк. – 597 с.
16. Ольштынский, Л. И. Разгром фашизма. СССР и англо-американские союзники во Второй мировой войне (политика и военная стратегия: факты, выводы, уроки истории / Л. И. Ольштынский. – М. : ИТРК, 2010. – 360 с.

УДК 94:327.5((47+57):430)«1941-1945»:94:327.5(476.2)«1943»

**В. У. Цацарын**
Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

## ПАДЗЕІ БІТВЫ ЗА ДНЯПРО НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ

*Разгледжаны асноўныя падзеі Бітвы за Дняпро – важнейшай падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Паказана значнасць падзеі ў ходзе вызвалення тэрыторыі Савецкага Саюза ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Больш дэталёва паказаны падзеі, звязаныя з бітвай за Дняпро на тэрыторыі*

*БССР. Пададзена храналогія падзей Чарнігаўска-Прыпяцкай наступальнай аперацыі як часткі Чарнігаўска-Палтаўскай стратэгічнай наступальнай аперацыі. Даводзіцца, што Бітва за Дняпро – гэта важная частка, пачатак, вызвалення Беларусі ад нацысцкай акупацыі.*

Бітва за Дняпро – важная падзея ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Яна вылучаецца тым, што лакалізуецца на прасторы ў амаль 700 кіламетраў. Такіх маштабных фарсіраванняў рэк да таго часу гісторыя войн яшчэ не ведала. Сітуацыю для Чырвонай Арміі ўскладнялі яшчэ два моманты. Першы з іх – прыроднага характару. Дняпро – рака вялікая, глыбокая і паўнаводная. І, як рэкі, што накіраваны ў Чорнае мора, высокім берагам мае менавіта правы, заходні. У гэтым сэнсе, у 1941 годзе нацысцкім войскам было фарсіраваць Дняпро значна прасцей, бо яны наступалі з высокага берага на нізкі. Другі момант, – гэта Усходні вал: сістэма ўмацаванняў, магутная абарончая лінія, створаная ў 1943 годзе. Вядома выхваленне, прыпісваемае Гітлеру, што хутчэй вада ў Дняпры пацячэ ў адваротны бок, чым Чырвоная Армія здолее пераадолець гэтыя ўмацаванні.

Бітва за Дняпро – падзея даволі добра вывучаная і апісаная як асобнымі даследчыкамі падзей Вялікай Айчынная і Другой сусветнай войнаў, так і ў манаграфіях агульнага, калектыўнага характару. Аднак не так шмат публікацый, прысвечаных падзеям бітвы, што адбываліся на Гомельшчыне.

Тэрыторыю Гомельшчыны закранула Чарнігаўска-Прыпяцкая аперацыя (як частка больш маштабнай Чарнігаўска-Палтаўскай наступальнай аперацыі), што праходзіла з 26 жніўня па 30 верасня 1943 года. Задзейнічаны былі Цэнтральны, Варонежскі і Стэпавы фронты. Ім супрацьстаялі часткі груп армій “Цэнтр” і “Поўдзень” вермахта, злучэнні 4-га і 6-га паветраных флотаў [1, с. 555].

Нягледзячы на аптымізм фашысцкага камандавання, доўга трымаць абарону на Левабярэжжы ім не ўдалося. Да канца верасня 1943 года Чырвоная Армія з баямі прайшла каля 250–300 кіламетраў і выйшла да Дняпра. Таксама праз цяжкія і крывавыя баі, часам без належнага прыкрыцця і выкарыстоўваючы падручныя сродкі пераправы, савецкім воінам удалося захапіць важныя плацдармы на заходнім беразе Дняпра. Пачалося і вызваленне БССР. Як вядома, быў вызвалены першы раённы цэнтр рэспублікі – Камарын. Страты Чырвонай Арміі падчас Чарнігаўска-Палтаўскай аперацыі ацэньваюцца больш чым у 420 тысяч чалавек, з іх беззваротныя – больш за 102 тысячы чалавек [2, с. 597]. Страты менавіта ў Чарнігаўска-Прыпяцкай аперацыі – больш за 141 тысяча чалавек, з іх беззваротныя – больш за 33,5 тысячы чалавек.

З 25 верасня на гомельскім накірунку цяжкія баі праводзілі войскі 61-ай і 48-ай армій фронта, якім камандаваў К. К. Ракасоўскі. Да ракі Сож першым удалося выйсці падраздзяленням 65-ай арміі. Амаль штурмам ім удалося захапіць плацдарм на міжрэччы Сажа і Дняпра. Пасля гэтага перайшлі да абароны [3, с. 211]. Трымалі абарону на дваццаці кіламетрах. І было вырашана праводзіць фарсіраванне Дняпра на ўсім гэтым участку (ад Лоева да Радуля). Гэта дазволіла б захапіць некалькі плацдармаў ужо на іншым беразе Дняпра.

Для распылення намаганняў ворага чатыры стралковыя дывізіі накіравалі ў наступленне на Міхалькі і Аляксандраўку. А пяць дывізій і адну брыгаду – на фарсіраванне Дняпра на азначаным участку. Пры гэтым, галоўны ўдар наносіўся ў накірунку вёсак Каўпень і Надзвін.

На поўдзень войскі Чырвонай Арміі прасоўваліся пабатальённа ў начны час. Таму перагрупавацца ўдалося толькі 12 кастрычніка. Але гэта дало плён. Удалося стварыць перавагу над войскамі Германіі. Цяпер у Чырвонай Арміі на 20-кіламетровым плацдарме размяшчалася не адна, а чатыры стралковыя дывізіі [4, с. 44–45].

К. К. Ракасоўскі ў сваіх пасляваенных мемуарах асабліва пахваліў камандуючага гэтымі войскамі П. І. Батава за знаходлівасць і хітрасць. Па словах палкаводца, камандарм арміі Батаў справіўся з манёўрам усяго за 6 сутак. Адзін корпус (камандваў ім генерал Д. І. Самарскі) паводзіў сябе вельмі актыўна ў міжрэччы Сожа і Дняпра, адцягваючы на сябе ўсю ўвагу войск вермахта. А астатнія здолелі скрытна перайсці на новыя пазіцыі [5, с. 236]. У сваю чаргу, П. І. Батаў у мемуарах за дадзенае рашэнне хваліць начальніка штаба “сваёй” 65-ай арміі генерал-маёра І. П. Глебава [6, с. 162].

Фарсіраванне Дняпра на прызначаным участку мела вялікія цяжкасці. Сама рака была шырокай (каля 400 метраў) і глыбокай (да 8 метраў). У ворага меліся дзве лініі абароны: першая траншэя размяшчалася амаль адразу каля вады, другая – вышэй, па беразе “старыка”. Былі там зроблены і кропкі вядзення прамога артылерыйскага абстрэлу.

Разумеючы абстаноўку, кіраўніцтва, у асобе К. К. Раксаоўскага перадало 65-ай арміі амаль усе сродкі пераправы (тым не меньш, забяспечанасць імі ацэньвалася напярэдадні да пачатку аперацыі толькі на 20–25 %, таму экстранна рабіліся плыты і лодкі, на якіх абсталёўваліся месцы для прыладжвання кулямётаў, а таксама назапашвалі анучі, драўляныя заклёпкі і кубкі для вычэрпвання вады, бо засмаліць лодкі, а тым больш, даць ім высахнуць, магчымасці не было) і прыкрыцця, якія меліся ў распараджэнні. Для адцягвання ўвагі войск вермахта напярэдадні пачалі наступальныя акцыі дзве яшчэ не перагрупаваўшыяся арміі (50-ая і 3-яя). Значных вынікаў гэтае наступленнне даць

не магло, але патрэбны эффект быў ім дасягнуты [7, с. 29]. Паралельна праводзілі трэніроўкі (на азёрах Белавод, Заборская і іншых) весляроў і сапёраў (іх вучылі збіраць паромы). Нялішнімі былі і рэзервы, якія падцягнуліся з вызваленых раёнаў Украіны [4, с. 50].

Само фарсіраванне Дняпра распачалі рэактыўныя мінамёты ўранку 15 кастрычніка 1943 года. Іх падтрымалі іншыя гарматы, а крыху пазней і авіяцыя. Тут жа пачалася пераправа. Першымі ішлі найбольш падрыхтаваныя штурмавікі, якіх вылучылі з кожнага падраздзялення (каля 600 чалавек). Прыменена была і завеса з дыму.

"Першапраходцы" здолелі захапіць плацдармы глыбінёй да паўкіламетра: каля вёсак Крупейкі і Шчытцы. Пасля гэтага да фарсіравання Дняпра перайшлі асноўныя сілы 65-ай арміі. Цяжкія баі вялі розныя падраздзяленні каля вёсак Бывалькі, Крупейкі, Шчытцы, а таксама на поўдні ад Лоева. Першым з названых населеных пунктаў удалося вызваліць Шчытцы [3, с. 212].

Фашысты імкнуліся адкінуць чырвонаармейцаў назад за Дняпро. З Гомеля і міжрэчча Сожа і Дняпра былі перакінуты немалыя рэзервы (дзве пяхотныя дывізіі) [3, с. 212–213]. Аднак плёну ім гэта не прынесла. Зранку 16 кастрычніка пераправіцца праз Дняпро на ўтрымліваемы плацдарм здолелі ўсе палкі дывізій першага эшалона. Вельмі дапамагло ў гэтым будаўніцтва сапёрамі маста меньш чым за суткі ва ўмовах перыядычных абстрэлаў нямецкімі войскамі.

Лоеў быў вызвалены да вечара 16 кастрычніка 1943 года. Палітаддзел 106-ай Забайкальскай дывізіі далі справаздачу 17 кастрычніка 1943 года, што Даурскі стралковы полк абыйшоў у Лоеў, стварыўшы фашыстам пагрозу акружэння. А 263-ці Нерчынскі полк з пачынаючы з паўднёвай часткі, к вечару ачысціў Лоеў ад ворага. Было знішчана каля 400 нямецкіх ваеннаслужачых, захоплена 7 палонных, 23 гарматы, 15 мінамётаў, шмат кулямётаў, аўтаматаў, вінтовак, некалькі радыёстанцый і тэлефонных апаратаў, шмат тэлефоннага кабелю, склад рэчаў [8, с. 58]. У той жа дзень былі вызвалены Крупейкі і Бывалькі.

Паралельна пераправляліся праз Дняпро іншыя вайсковыя часткі Чырвонай Арміі (усяго перад пачаткам фарсіравання войскі падзялілі на тры эшэлоны).

Немцы, каб узмацніць фронт, былі вымушаны перакідваць часткі з міжрэчча Сожа і Дняпра ў паўднёва-заходні накірунак. Але гэта ім не дапамагло: 18 кастрычніка 1943 года Чырвоная Армія вызваліла вёскі Карпаўка, Хамінка, Абакумы, Шарпілаўка, Рудня Каменева, Папоўка. Іншыя часткі савецкіх войскаў у гэты ж час ачысцілі ад ворага Мохаў, Каўпень і некаторыя іншыя вёскі [3, с. 213–214].

Чырвоная Армія падышла да так званых “надзвінскіх пазіцый”: да другой паласы абароны нямецка-фашысцкіх войскаў, што мела галоўным цэнтрам вёску Надзвін. Прарваць абарону штурмам не ўдалося. Тады К. К. Ракасоўскі быў вымушаны аддаць загад прыпыніць наступленне і дачакацца падыходу рэзерваў (чакалі пяць карпусоў) [9, с. 2].

61-ая армія (камандаваў П. А. Бялоў) была накіравана наступаць да Брагіна. Яна размясцілася на заходнім беразе Дняпра, фарсіраваўшы раку, яшчэ ў верасні 1943 года, але далей поспех не развіла. Тым не меньш, дзякуючы таму, што плацдарм быў утрыманы, цяпер можна было праводзіць наступленне. І 22 кастрычніка 1943 года часткі гэтай арміі з баямі авалодалі вёскамі Дзяражычы, Новая Лутава, Старая Лутава, Гарадок, Вазон, Райск і Міхалёўка. А 24 кастрычніка 1943 года імі былі вызвалены ад акупацыі населеныя пункты Сяўкі, Добры Рог, Трасцянец, Дуброўка, Астравы, Тучкі і Чанец.

20 кастрычніка 1943 года адбыліся перайменаванні франтоў: Варонежскі стаў называцца Першым Украінскім, Стэпавы – Другім Украінскім, Паўднёва-Заходні – Трэцім Украінскім, Паўднёвы – Чацьвёртым Украінскім. Яны працягвалі Бітву за Дняпро, вызваляючы тэрыторыю УССР. Цэнтральны фронт стаў называцца Беларускім. Пад камандаваннем К. К. Ракасоўскага ён праводзіў наступальныя аперацыі на тэрыторыі Гомельшчыны: Гомельска-Рэчыцкую, Калінкавіцка-Мазырскую і Рагачоўска-Жлобінскую. Іх да бітвы за Дняпро не адносяць. Але дзякуючы іх правядзенню напачатку 1944 года значная частка цяперашняй Гомельскай вобласці была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Такім чынам, Бітву за Дняпро можна лічыць не толькі падрыхтоўкай, але і пачаткам вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Падзеі на тэрыторыях сучасных Брагінскага і Лоеўскага раёнаў – вызваленне Камарына і фарсіраванне Дняпра каля Лоева – гэта важная частка падзей 1943 года. Яны і самі па сабе – праява гераізма воінаў Чырвонай Арміі. І падрыхтавалі вызваленне двух абласных цэнтраў БССР: Гомеля (16 лістапада 1943 года) і Мазыра (14 студзеня 1944 года).

## Крыніцы і літаратура

1. Стратегический очерк Великой Отечественной войны, 1941–1945 гг. / С. П. Платонов [и др.]; Военно-научное управление Генерального Штаба : Военно-исторический отдел. – М. : Воениздат, 1961. – 982 с.

2. Великая Отечественная война 1941–1945 годов: в 12 т. / Министерство обороны Российской Федерации. – М. : «Кучково поле», 2012. – Т. 3: Битвы и сражения, изменившие ход войны / М. В. Виниченко [и др.]. – 2012. – 864 с.

3. Памяць. Лоеўскі раён: гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / укладальнікі В. П. Крупейчанка [і інш]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2000. – 588 с.
4. Батов, П. И. Форсирование рек. 1942–1945 гг. / П. И. Батов. – М. : Воениздат, 1986. – 158 с.
5. Рокоссовский, К. К. Солдатский долг / К. К. Рокоссовский. – 5-е изд. – М. : Воениздат, 1988. – 367 с.
6. Батов, П. И. В походах и боях / П. И. Батов. – 3-е изд., испр. и доп. – М. : Воениздат, 1974. – 528 с.
7. Свинтицкий, Ф. А. Лоевский плацдарм / Ф. А. Свинтицкий. – Могилёв : МГУП, 2014. – 235 с.
8. Долатаў, А. С. Дапаможнік па краязнаўству Лоеўшчыны / А. С. Долатаў. – Лоеў : Карані, 2002. – 81 с.
9. Лизарев, А. Битва за Днепр: начало освобождения / А. Лизарев // Гомельская праўда. – 2009. – 2 ліпеня. – С. 2.

УДК 94(476))«1944»

**С. А. Елизаров**
Гомельский государственный технический
университет имени П. О. Сухого

## БЕЛОРУССКАЯ ССР 1944 ГОДА: СОВЕТСКО-ПОЛЬСКАЯ ГРАНИЦА – АДМИНИСТРАТИВНО-ТЕРРИТОРИАЛЬНОЕ ДЕЛЕНИЕ

*В статье рассматриваются изменения в областном административно-территориальном делении Белорусской ССР в первый год после полного освобождения республики от немецко-фашистских захватчиков. Отмечается, что эти изменения определялись общей линией высшего союзного руководства на дробление административно-территориального деления для усиления контроля и оперативного управления процессами послевоенного возрождения в условиях продолжавшейся войны. В Белорусской ССР этот процесс стимулировался ещё и внешнеполитическими обстоятельствами, связанными с изменением советско-польской границы.*

Великая Отечественная война потребовала перестройки всех сфер жизни советского общества, в том числе и создания соответствующей военным условиям системы управления, в том числе и реорганизации административно-территориального деления как неотъемлемого его